ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
28.08.2025 № 155

# Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для I–V класаў спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення з беларускай мовай навучання і выхавання; для I–V класаў спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні з беларускай мовай навучання і выхавання

# ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» (далей – вучэбная праграма) для I–V класаў спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення з беларускай мовай навучання і выхавання, для I–V класаў спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні з беларускай мовай навучання і выхавання распрацавана на аснове вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для I–IV класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання.

2. Колькасць гадзін, прадугледжаных у главе 2 дадзенай вучэбнай праграмы на засваенне вучэбнага матэрыялу адпаведнай тэмы, з’яўляецца прыкладнай і залежыць ад выбару настаўнікам метадалогіі навучання і выхавання, адпаведных відаў дзейнасці і магчымасцей вучняў. Настаўнік мае права пераразмеркаваць колькасць гадзін на вывучэнне пэўных тэм у межах гадзін, адведзеных на авалоданне прадметам на працягу навучальнага года, аднак пры гэтым на кожным уроку неабходна надаваць увагу ўсім відам маўленчай дзейнасці – чытанню, гаварэнню, аўдзіраванню і пісьму. Вывучэнне асаблівасцей форм вуснай і пісьмовай мовы на ўсіх яе ўзроўнях (фанетычным, лексічным, граматычным) дазваляе праводзіць мэтанакіраванае моўнае навучанне вучняў першай ступені адукацыі.

3. Мэта – фарміраванне ў вучняў базавых уменняў і навыкаў валодання вуснай і пісьмовай формамі беларускай мовы праз засваенне такіх адзінак мовы, як гук, склад, слова, сказ, тэкст. Развіццё маўленчых навыкаў спрыяе станаўленню асобы вучня, актывізацыі яго пазнавальнай дзейнасці, выхаванню маральна-этычных якасцей, эмацыянальна-каштоўнасных адносін да навакольнай рэчаіснасці, культуры зносін. Пры гэтым веды, уменні і навыкі разглядаюцца як сродак паўнацэннага развіцця асобы вучня.

Дадзеная вучэбная праграма на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ўключае «Навучанне грамаце» (I клас) і «Беларускую мову» (II–V класы). Навучанне грамаце ўключае перыяды: падрыхтоўчы (дабукварны), асноўны (букварны) і заключны (паслябукварны). Урокі навучання грамаце могуць быць камбінаванымі: на адным уроку настаўнік можа вучыць як чытанню, так і пісьму.

Дадзеная вучэбная праграма прадугледжвае выкарыстанне кампетэнтнаснага падыходу, накіраванага на фарміраванне ў вучняў моўнай, маўленчай, камунікатыўнай і метапрадметных кампетэнцый у навучанні беларускай мове, і асобасна арыентаванага падыходу, які абапіраецца на ўлік інтарэсаў і вызначэнне перспектыў развіцця кожнага

вучня адпаведна яго магчымасцям і здольнасцям. Навучанне чытанню і пісьму вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення і цяжкасцямі ў навучанні неабходна праводзіць згодна з прынцыпамі прыродаадпаведнасці і індывідуалізацыі, якія маюць на ўвазе ўлік узроставых і індывідуальных асаблівасцей вучняў 6–7-гадовага ўзросту з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

4. Асноўнымі задачамі навучання беларускай мове з’яўляюцца:

фарміраванне правільнага вымаўлення гукаў беларускай мовы, засваенне літар беларускага алфавіта і развіццё ўмення суадносіць іх з адпаведнымі гукамі;

навучанне першапачатковаму чытанню і пісьму;

развіццё фанематычнага слыху (уменне распазнаваць і вылучаць асобныя гукі ў слове і складзе, вызначаць іх паслядоўнасць);

фарміраванне і развіццё гукавога аналізу і сінтэзу (уменне вылучаць гук у слове, чуць і вылучаць першы і апошні гукі ў слове, вызначаць пазіцыю гука ў слове, паслядоўнасць і колькасць гукаў у слове, называць словы з зададзеным гукам, умець складаць словы з зададзеных гукаў і гэтак далей);

фарміраванне першасных ведаў пра найважнейшыя моўныя адзінкі, неабходных для фарміравання маўленчых навыкаў і ўменняў;

фарміраванне навыкаў і ўменняў па ўсіх відах маўленчай дзейнасці (слуханне, гаварэнне, чытанне і пісьмо);

узбагачэнне слоўнікавага запасу;

развіццё звязнага вуснага маўлення;

развіццё цікавасці да чытання як сродку пазнання, фарміраванне чытацкага кругагляду, уменняў работы з рознымі крыніцамі інфармацыі;

фарміраванне ўменняў вучэбнай дзейнасці;

фарміраванне камунікатыўнай культуры малодшых школьнікаў;

усведамленне беларускай мовы як нацыянальнай культурнай каштоўнасці;

разумовае, маральнае і сацыякультурнае развіццё асобы вучняў.

5. Асноўнай формай правядзення вучэбных заняткаў па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» з’яўляецца ўрок, на якім калектыўныя формы арганізацыі вучэбнай дзейнасці вучняў спалучаюцца з рознымі формамі дыферэнцыяцыі і індывідуалізацыі адукацыйнага працэсу. У залежнасці ад задач кожнага этапу ўрока выкарыстоўваецца калектыўная, групавая або індывідуальная форма работы вучняў.

У працэсе навучання беларускай мове неабходна рацыянальнае спалучэнне разнастайных метадаў навучання, як прадуктыўных, так і рэпрадуктыўных: тлумачальна-ілюстрацыйнага (інфармацыйна-рэцэптыўнага), рэпрадуктыўнага, праблемнага, часткова-пошукавага (эўрыстычнага).

Навучанне першапачатковаму чытанню і пісьму ажыццяўляецца на аснове гукавога аналітыка-сінтэтычнага метаду навучання грамаце з шырокім выкарыстаннем гульнявых метадаў і прыёмаў.

Выбар форм і метадаў навучання і выхавання вызначаецца настаўнікам на аснове мэт і задач вывучэння канкрэтнай вучэбнай тэмы, патрабаванняў да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, якія сфармуляваны ў главе 2 дадзенай вучэбнай праграмы.

Тэхналогія навучання першапачатковаму пісьму кіруецца прынцыпамі паэлементнага напісання літар (фарміраванне ў памяці вучня выразнай зрокавай выявы літары, якая складаецца з пэўных элементаў); аднаварыянтнага (стабільнага) напісання літар, групоўкі літарных знакаў (аб'яднанне літар у групы па прымеце наяўнасці ў іх агульнага элемента). Усе прынцыпы на практыцы рэалізуюцца праз паэлементна-цэласны метад навучання пісьму, які ўключае метадычныя прыёмы аналітычнага ўспрымання; практычнага канструявання; капіравання; такціравання; алгарытмізацыі.

6. Асноўныя патрабаванні да вынікаў засваення зместу вучэбнага матэрыялу выражаюцца ў тым, што ў вучняў будуць сфарміраваны:

6.1. веды аб:

розных узроўнях беларускай мовы – фанетыка-графічным, граматычным, арфаэпічным, арфаграфічным;

асноўных прынцыпах графічнага абазначэння гукаў беларускай мовы;

спосабах складання тэксту (звязнага выказвання);

6.2. уменні:

адрозніваць на слых і вымаўляць гукі і гукаспалучэнні, у тым ліку спецыфічныя для беларускай мовы;

суадносіць гукі і літары пры першасным авалоданні беларускай графіка-арфаграфічнай сістэмай;

графічна дакладна і безадрыўна пісаць гукаспалучэнні і словы;

карыстацца тлумачальным і арфаграфічным слоўнікамі;

вызначаць тэму і асноўную думку тэксту;

ствараць звязнае вуснае выказванне паводле правіл моўнага этыкету.

Дадзеная вучэбная праграма складзена паводле дыдактычных прынцыпаў даступнасці, паслядоўнасці, сістэмнасці, мэтазгоднасці, адэкватнасці, навучання ад простага да складанага, калі падача новага матэрыялу базіруецца на ўжо вядомым і ў цеснай сувязі з ім. Адначасова з развіццём асноўных відаў дзейнасці ў пачатковай школе для вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення і для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні вырашаюцца карэкцыйныя задачы, накіраваныя на палягчэнне засваення вучэбнага матэрыялу і карэкцыю розных парушэнняў псіхафізічнага развіцця. Таму змест вучэбнага прадмета «Беларуская мова» з мэтай узмацнення яго кампенсаторна-карэкцыйнай і развіццёвай функцый мае

камунікатыўна-практычную накіраванасць, змяшчае вучэбны матэрыял, засваенне якога павінна забяспечыць фарміраванне камунікатыўных уменняў, удасканаленне пачуццёвага і практычнага вопыту вучняў, развіццё асноўных пазнавальных працэсаў дзеля забеспячэння метапрадметнай кампетэнцыі.

7. Работа па развіцці маўлення праводзіцца на кожным уроку беларускай мовы на працягу навучальнага года. На вывучэнне асобных раздзелаў зместу вучэбнага прадмета «Беларуская мова» даецца прыкладная колькасць гадзін. Настаўнік сам вызначае неабходную колькасць гадзін на кожную тэму, зыходзячы з уласнага вопыту, улічваючы падрыхтаванасць вучняў, умовы іх работы.

Пазакласнае чытанне заключаецца ў чытанні-разглядванні невялікіх маляўнічых кніг пра школу, сяброўства, добрыя ўчынкі людзей, любоў да прыроды з мэтай фарміравання цікавасці да самастойнага чытання, ведаў пра тэматыку літаратуры, гігіену чытання і беражлівых адносін да кніг. Заняткі праводзяцца ў II–V класах адзін раз на два тыдні з улікам узроўню маўленчага развіцця і падрыхтоўкі вучняў. Вучні знаёмяцца са школьнай бібліятэкай, навучаюцца вылучаць назвы кніг, знаходзіць творы канкрэтнага аўтара.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

### Навучанне грамаце і развіццё маўлення

### I клас (180/150 гадзін[2])

Навучанне грамаце ажыццяўляецца ў межах трох перыядаў: падрыхтоўчага, асноўнага і заключнага. Працягласць перыядаў вызначаецца ў залежнасці ад ступені гатоўнасці вучняў да навучання. Навучанне грамаце вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення і цяжкасцямі ў навучанні разглядаецца не толькі як вучэбны, але і як карэкцыйны працэс. Навучанне будуецца з улікам відаў і ступені цяжкасцей кожнага вучня і неадрыўна звязана з правільным гукавымаўленнем і фанематычным успрыманнем. Значнае месца для гэтай работы адводзіцца ў падрыхтоўчым перыядзе.

### Падрыхтоўчы (дабукварны) перыяд (30/30 гадзін)

---

[2] Першая лічба ўказвае колькасць вучэбных гадзін пры арганізацыі вучэбнага працэсу для вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення, другая – колькасць вучэбных гадзін пры арганізацыі вучэбнага працэсу для вучняў з цяжкасцямі ў навучанні.

Гук. Адрозненне гукаў навакольнай рэчаіснасці (нямоўных) і моўных гукаў. Галосныя гукі: а, у, о, і, ы, э. Вымаўленне галосных гукаў. Вылучэнне гука і яго абазначэнне ўмоўным сімвалам. Дакладнае, правільнае вымаўленне гукаў у складах, у словах. Развіццё слыхавога і зрокавага ўспрымання на матэрыяле гульнявых практыкаванняў. Роля галоснага гука ў адрозненні сэнсу слова (параўнанне слоў-схем, якія адрозніваюцца галосным гукам). Падбор слоў на зададзены галосны гук з апорай на сімвал і малюнкі. Распазнаванне зададзенага гука ў словах. Вызначэнне месца гука ў слове: у пачатку, у канцы, у сярэдзіне.

Зычныя гукі. Цвёрдыя і мяккія, звонкія і глухія зычныя гукі. Вылучэнне на слых зычнага гука і яго ўласцівасцей. Сімвалы, якія абазначаюць зычныя гукі. Дыферэнцыяцыя цвёрдых і мяккіх, звонкіх і глухіх зычных гукаў. Распазнаванне слова пад прадметным малюнкам па графічнай схеме. «Чытанне» складоў рознай структуры (прамы, адваротны) з апорай на сімвалы гукаў. Самастойны падбор слоў на зададзены зычны гук.

Склад. Практычнае знаёмства са складам. Падзел слоў на склады. Прагаворванне слоў па складах з апорай на схемы да прадметных малюнкаў. Паслядоўнасць гукаў ў складзе, слове. Адпаведнасць схемы слова малюнку.

Націск. Вылучэнне націскных складоў у слове. Роля націску ў адрозненні сэнсу слова складам (за́мкі–замкі́).

Слова. Практычнае знаёмства са словам. Схема слова. Падбор слоў да малюнкаў. Вылучэнне слоў у вусным маўленні. Аб’яднанне слоў у тэматычныя групы (расліны, жывёлы, птушкі, транспарт, мэбля і іншае).

Знаёмства са словамі, якія абазначаюць прадметы, дзеянні прадметаў, прыметы прадметаў.

Сказ. Практычнае знаёмства са сказам. Вылучэнне слоў у сказе. Складанне сказаў да малюнкаў. Вылучэнне сказаў з вуснага маўлення.

Фарміраванне ў вучняў агульнамаўленчых навыкаў, развіццё слыхавога і зрокавага ўспрымання, удасканаленне вымаўлення, развіццё артыкуляцыйнага апарату. Асноўныя віды работы: азнаямленне з прадметамі і з’явамі навакольнага асяроддзя, дыдактычныя гульні і гульнявыя практыкаванні.

Слоўнікавая работа: удакладненне і пашырэнне ўяўленняў вучняў пра навакольную рэчаіснасць і развіццё на гэтай аснове маўлення. Асноўныя віды работы: назіранні, работа з прадметнымі малюнкамі, сюжэтнымі ілюстрацыямі; суаднясенне слоў з прадметамі і з’явамі навакольнага асяроддзя.

Удакладненне і развіццё зрокавага ўспрымання і прасторавай арыенціроўкі. Падрыхтоўка да ўсведамлення вобраза літары, яе

пrасторавага размяшчэння, да спалучэння з іншымі літарамі з мэтай папярэджання недакладнага ўспрымання друкаваных або напісаных слоў.

Падрыхтоўка рукі да пісьма. Развіццё дробнай маторыкі. Размалёўванне, маляванне бардзюраў, абвядзенне па контуры, штрыхоўка ў розных напрамках. Напісанне асноўных элементаў рукапісных літар, спалучэнняў літар.

На працягу дабукварнага перыяду вырашаюцца асноўныя задачы:

фарміраванне цікавасці да навучання і выпрацоўка ўпэўненасці ў выкананні заданняў;

развіццё слыхавога і зрокавага ўспрымання;

каардынацыя дробных рухаў кісці рукі і пальцаў;

фарміраванне навыкаў гукавога аналізу і сінтэзу маўлення;

удакладненне і пашырэнне ведаў і ўяўленняў аб навакольнай рэчаіснасці;

правільнае вымаўленне і распазнаванне гукаў;

вылучэнне гукаў з гукавых радоў і слоў;

складанне гукавых радоў з асобных гукаў;

складанне слоў па зададзеных схемах;

падзел слоў на склады.

Асноўны перыяд (125/110 гадзін)

Парадак вывучэння гукаў, літар і складовых структур улічвае асаблівасці аналітыка-сінтэтычнай дзейнасці вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення і цяжкасцямі ў навучанні.

Паслядоўнае вывучэнне гукаў і літар, засваенне асноўных складовых структур. Засваенне гука: вылучэнне яго з маўлення, правільнае і выразнае вымаўленне, распазнаванне ў спалучэннях з іншымі гукамі, дыферэнцыяцыя гукаў. Засваенне літары: успрыманне агульнай яе формы, вывучэнне складу літары (элементаў і іх размяшчэння), параўнанне з іншымі, раней вывучанымі літарамі. Суаднясенне гука і літары.

Вывучэнне гукаў і літар: Аа, Уу, Оо, Мм, Іі, ы, Ээ, Кк, Тт, Хх, Нн, Вв, Пп, Сс, ы–і, Бб, Зз, п–б, с–з, Лл, Шш, Рр, ш–с, р–л, Жж, Ее, ж–ш, ж–з, с–з–ж–ш, е–э, Дд, ь, Гг, д–т, г–х, Яя, а–я, Фф, Чч, шч, Ёё, ў, Цц, ц-ц’, Дздз, д–дз, Юю, у–ю, й, і–й, Дждж, дж–ч, надрадковы знак ‘ (апостраф). Правільнае і выразнае вымаўленне гукаў, распазнаванне іх у пачатку, у сярэдзіне, у канцы слова.

Літара як знак для абазначэння гука на пісьме.

Утварэнне і чытанне слоў з засвоеных гукаў і літар. Утварэнне і чытанне складоў розных тыпаў. Складанне і чытанне слоў з двух складоў.

Абазначэнне гукаў літарамі. Складанне літар з графічных элементаў. Распазнаванне літары па элементах. Вылучэнне літары сярод напісаных люстраным чынам. Канструяванне літар. Параўнанне падобных літар.

Заключны перыяд (25/10 гадзін)

Чытанне складоў і слоў. Складанне слоў са складоў з апорай на прадметны малюнак. Схема слова. Дапаўненне складоў для ўтварэння новых слоў. Чытанне слоў з аднаго і двух складоў. Паўзы.

Успрыманне тэксту. Адказ на пытанні да тэксту, асэнсаванае чытанне невялікіх тэкстаў.

Навучанне пісьму. Развіццё дробнай маторыкі рук. Практычнае засваенне правільнага напісання графічных элементаў, літар і спалучэнняў літар.

Напісанне друкаваных літар. Напісанне літар па ўзоры, дапісванне літар, напісанне кароткіх слоў. Вялікая літара ў пачатку сказа, асобнае напісанне слоў у сказе, кропка ў канцы сказа.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ І КЛАСА

Вучні маюць уяўленне:

аб адрозненні гукаў навакольнай рэчаіснасці ад моўных гукаў;

падзеле слоў на склады;

функцыянаванні слоў у маўленні;

ужыванні вялікай літары ў пачатку сказа і кропкі ў канцы сказа.

Вучні ўмеюць:

слухаць пытанне, разумець яго, адказваць на зададзенае пытанне;

распазнаваць гукі і простыя гукаспалучэнні ў наваколлі і ў маўленні;

вылучаць словы-гукаперайманні;

адрозніваць галосныя гукі ад зычных гукаў;

падбіраць словы на зададзены гук;

адрозніваць словы з рознай колькасцю складоў;

вылучаць гукі ў слове, вызначаць іх паслядоўнасць;

правільна вымаўляць і чытаць гукі і склады;

спісваць склады, кароткія словы, сказы з 3–4 слоў з друкаванага і пісьмовага ўзору;

выкарыстоўваць вялікую літару ў пачатку сказа, кропку ў канцы сказа;

выкарыстоўваць вялікую літару ў пачатку ўласных імён;

пісаць пад дыктоўку склады, кароткія словы, напісанне якіх супадае з вымаўленнем;

правяраць напісанае па ўзоры;

чытаць невялікія тэксты (ад паскладовага чытання да чытання цэлым словам);

адказваць на пытанні па прачытаным тэксце;

складаць кароткае апавяданне з апорай на пытанні настаўніка;

складаць уласнае звязнае выказванне па серыі сюжэтных малюнкаў (3–4 сказы);

выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў паўсядзённым жыцці.

Вучні ведаюць:

літары беларускага алфавіта;

асноўныя характарыстыкі галосных і зычных гукаў беларускай мовы; цвёрдых і мяккіх зычных; звонкіх і глухіх зычных;

складаўтваральную ролю галосных гукаў.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

асноўныя элементы рукапісных літар;

кароткія вершы, загадкі, скорагаворкі на беларускай мове.

Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:

правільна і ў адпаведным тэмпе вымаўляць гукі і словы;

разумець сюжэтныя карцінкі, складаць невялікае апавяданне (3–5 сказаў) па серыі ілюстрацый / па сюжэтным малюнку (з дапамогай настаўніка);

паказваць і называць выявы прадметаў у паслядоўным парадку;

выкарыстоўваць дробную маторыку пры размалёўванні, маляванні, абвядзенні па контуры, штрыхоўцы, канструяванні простых прадметаў.

## II клас (136/102 гадзіны)

### Паўтарэнне вывучанага ў I класе (3/2 гадзіны)

Гукі і літары: суаднясенне, вымаўленне, чытанне і напісанне літар, складоў, слоў, сказаў. Складанне слоў з прапанаваных літар, асобных складоў. Складанне слоў па схемах. Складанне сказаў па малюнках. Практычнае замацаванне націску ў маўленні. Вялікая і малая літары. Спісванне з друкаваных і рукапісных узораў.

### Гукі і літары (43/29 гадзін)

Гукі і літары. Галосныя і зычныя гукі і літары. Суаднясенне гукаў і літар у слове. Гукі і літары дж, дз. Звонкія і глухія зычныя гукі.

Склад слова. Падзел слова на склады. Аднаскладовыя, двухскладовыя і трохскладовыя словы. Перанос слоў.

Націск. Націскныя і ненаціскныя галосныя ў словах. Роля націску ў адрозненні слоў.

Алфавіт. Парадак літар у алфавіце. Напісанне слоў у алфавітным парадку. Паняцце пра арфаграфічны слоўнік, карыстанне арфаграфічным слоўнікам.

Падзел слоў на склады і для пераносу. Асаблівасці пераносу слоў з літарамі й, ў.

Цвёрдыя і мяккія зычныя. Абазначэнне на пісьме мяккасці зычных літарамі е, ё, і, ю, я. Літара ь (мяккі знак) на канцы і ў сярэдзіне слоў. Перанос слоў з мяккім знакам.

Гукі і літары д–дз, т–ц, зацвярдзелыя зычныя: вымаўленне, напісанне. Парныя звонкія і глухія зычныя. Няпарныя па звонкасці-глухасці (санорныя) зычныя гукі.

Правапіс галосных о, э–а; ё, е–я.

Раздзяляльныя знакі апостраф (’) і ь (мяккі знак). Вымаўленне і напісанне слоў з апострафам, мяккім знакам.

Падоўжаныя зычныя: вымаўленне і абазначэнне на пісьме. Перанос слоў з падоўжанымі зычнымі.

Слова (55/43 гадзіны)

Агульнае паняцце аб слове як адзінцы мовы. Словы як назвы прадметаў, прымет, дзеянняў.

Словы, якія абазначаюць прадметы ці асоб і адказваюць на пытанні хто? што? Вылучэнне ў тэксце слоў, якія абазначаюць прадметы ці асоб.

Паняцце пра граматычную катэгорыю адушаўлёнасці-неадушаўлёнасці. Напісанне вялікай літары ў імёнах, прозвішчах, імёнах па бацьку, мянушках жывёл, назвах гарадоў, рэк, азёр і іншае.

Словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў і адказваюць на пытанні які? якая? якое? якія? Спалучэнне слоў – назваў прадметаў і слоў – абазначэнняў прымет.

Паняцце пра словы з блізкім і супрацьлеглым значэннямі.

Словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў ці асоб і адказваюць на пытанні што робіць? што робяць? што раблю? што зраблю? што зрабілі? і іншыя. Вылучэнне ў тэксце слоў, якія абазначаюць прыметы і дзеянні прадметаў.

Паняцце пра аднакаранёвыя словы. Вылучэнне і графічнае абазначэнне кораня ў аднакаранёвых словах. Падбор аднакаранёвых слоў.

Агульнае паняцце пра прыназоўнік. Прыназоўнікі на, у, з, са, пад, за, па, над, каля і іншыя, іх напісанне ў спалучэнні з іншымі словамі.

Сказ (15/10 гадзін)

Сказ як моўная адзінка, якая выражае закончаную думку. Афармленне сказа на пісьме. Складанне сказаў па малюнках і пры дапамозе схем. Сувязь слоў у сказах. Знакі прыпынку ў канцы сказа.

Тэкст (10/9 гадзін)

Лагічны парадак сказаў у тэксце. Характарыстыка і афармленне тэксту. Тэма і асноўная думка тэксту. Загаловак тэксту.

Паўтарэнне. Гукі і літары. Правапіс галосных і зычных. Знакі прыпынку ў канцы сказаў. Асноўная думка, загаловак тэксту.

Паўтарэнне (10/9 гадзін)

Гукі і літары. Суаднясенне гукаў і літар у слове. Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі. Зацвярдзелыя, падоўжаныя зычныя гукі. Алфавіт. Падзел слоў для пераносу.

Словы, якія абазначаюць назвы прадметаў, назвы прымет, назвы дзеянняў. Правапіс слоў з вялікай літары.

Сказ. Лагічная паслядоўнасць сказаў у тэксце.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ II КЛАСА

Вучні маюць уяўленне:

аб адрозненнях друкаванага і рукапіснага тэксту;

адрозненні галосных і зычных гукаў, цвёрдых і мяккіх зычных;

інтанацыйным афармленні маўлення;

ужыванні вялікай літары.

Вучні ўмеюць:

дакладна вымаўляць гукі і гукаспалучэнні, у тым ліку спецыфічныя для беларускай мовы;

чытаць невялікія тэксты;

пісаць пад дыктоўку літары, склады, кароткія словы;

самастойна складаць і запісваць кароткія словы;

устаўляць прапушчаныя літары ў словах пры спісванні.

Вучні ведаюць і прымяняюць вучэбны матэрыял у розных відах дзейнасці:

разумеюць і ўзнаўляюць беларускую фанетыку, графіку і лексіку ў паўсядзённым жыцці;

суадносяць ілюстрацыі і слоўныя абазначэнні;

адшукваюць і выбіраюць патрэбны моўны матэрыял у тэксце.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

ілюстрацыі, апорныя словы, заданні як матэрыял для складання звязнага тэксту;

вершы, пацешкі, скорагаворкі, загадкі.

Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:

разумець сюжэтныя, прадметныя малюнкі, серыі ілюстрацый;

чытаць невялікія сказы з рознай інтанацыяй;

разумець тэму і асноўную думку тэксту.

III клас (170/85 гадзін)

Паўтарэнне вывучанага ў II класе (10/6 гадзін)

Вуснае і пісьмовае маўленне. Суаднясенне гукаў і літар. Сэнсаадрознівальная роля гукаў. Абазначэнне мяккасці на пісьме. Зацвярдзелыя зычныя. Націск. Падзел слоў для пераносу.

Сувязь слоў у сказе. Лагічная паслядоўнасць сказаў у тэксце.

Гукі і літары (55/25 гадзін)

Галосныя і зычныя, звонкія і глухія гукі і літары. Гукі [дж], [дз] і літары дж, дз. Алфавітны парадак слоў.

Цвёрдыя і мяккія зычныя. Абазначэнне мяккасці зычных на пісьме. Літара ь на канцы слоў і ў сярэдзіне слоў. Перанос слоў з літарай ь. Зацвярдзелыя зычныя. Перанос слоў з літарамі дж, дз.

Колькаснае суаднясенне гукаў і літар у слове.

Правапіс о, э–а. Правапіс ё, е–я.

Падзел слова на склады і для пераносу. Абазначэнне націску ў слове.

Спісванне слоў, сказаў, тэкстаў. Сувязь слоў у сказе. Знакі прыпынку ў канцы сказаў. Тэма, асноўная думка, загаловак тэксту.

Слова (70/35 гадзін)

Паняцце пра слова як адзінку мовы і састаўную частку сказа. Лексічнае значэнне слова. Паняцце аб прамым і пераносным значэнні слова. Ужыванне слоў у прамым і пераносным значэннях. Выкарыстанне прамога і пераноснага значэння слова пры складанні сказаў. Прамое і пераноснае значэнне слова ў тлумачальным слоўніку.

Словы з блізкім і супрацьлеглым значэннем. Блізкае і супрацьлеглае значэнні слоў у тлумачальным слоўніку.

Састаў слова. Зменная частка слова – канчатак. Нулявы канчатак. Значэнне канчатка ў змяненні слова і сувязі слоў у сказе.

Аснова як нязменная частка слова. Корань як агульная частка аднакаранёвых слоў. Адрозненне аднакаранёвых слоў і форм аднаго слова.

Прыстаўка, яе роля ў слове. Ужыванне і ўтварэнне слоў з прыстаўкамі. Суфікс, яго роля ў слове. Ужыванне і ўтварэнне слоў з суфіксамі. Вылучэнне прыстаўкі і суфікса ў слове. Разбор слова па саставе.

Правапіс звонкіх і глухіх зычных у корані слова. Правапіс прыставак аб-, ад-, над-, пад-; прыставак з- (с-), уз- (ус-), раз- (рас-), без- (бес-), бяз- (бяс-).

Правапіс раздзяляльных знакаў апострафа і мяккага знакаў словах. Напісанне апострафа пасля прыставак. Падзел для пераносу слоў з апострафам.

Прыстаўкі і прыназоўнікі. Адрозненне прыстаўкі ад прыназоўніка. Работа з тлумачальным слоўнікам.

## Сказ (15/8 гадзін)

Сказ як асноўная адзінка мовы. Сувязь слоў у сказе. Тыпы сказаў: апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя сказы. Клічныя сказы: інтанацыя, знакі прыпынку ў канцы сказаў.

Галоўныя і даданыя члены сказа. Дзейнік і выказнік. Вылучэнне дзейніка і выказніка ў сказе. Даданыя члены сказа.

Сувязь слоў у сказе. Сувязь слоў у словазлучэнні.

Простыя і складаныя сказы. Адрозненне паміж простым і складаным сказамі. Знакі прыпынку ў складаных сказах.

## Тэкст (10/6 гадзін)

Тэкст як сэнсава звязнае выказванне. Афармленне тэксту на пісьме. Тэма і асноўная думка тэксту. Загаловак тэксту. Сувязь і лагічная паслядоўнасць сказаў у тэксце. Аднаўленне дэфармаванага тэксту.

## Паўтарэнне (10/5 гадзін)

Слова і яго лексічнае значэнне. Састаў слова. Разбор слова па саставе. Галоўныя і даданыя члены сказа. Простыя і складаныя сказы. Тэкст.

# АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ III КЛАСА

Вучні маюць уяўленне:

аб правапісе звонкіх і глухіх зычных у корані слова;

правапісе прыставак;

прамым і пераносным значэнні слоў;

блізкім і супрацьлеглым значэнні слоў;

саставе слова;

абазначэнні мяккасці зычных гукаў на пісьме;

правапісе раздзяляльных знакаў апострафа і мяккага знака ў словах;

паслядоўнасці слоў у сказе;

асноўных прыметах тэксту;

ужыванні вялікай літары ў напісанні імён, прозвішчаў людзей, назваў краін і гарадоў, мянушак жывёл.

Вучні ўмеюць:

выконваць гука-літарны аналіз слоў;

адрозніваць зычныя і глухія, цвёрдыя і мяккія гукі, гукі [ў], [дж], [дз’], іх абазначэнне літарамі;

правільна пісаць літары о, э, а і е, ё, я ў залежнасці ад націску;

вызначаць значэнні слоў;

разбіраць словы па саставе;

правільна пісаць мяккі знак і апостраф;

суадносіць словы з прадметамі, распазнаваць словы паводле іх значэння;

правільна ставіць знакі прыпынку ў канцы сказа;

вызначаць тыпы сказаў;

вылучаць галоўныя і даданыя члены сказа;

адказваць на пытанні па змесце тэксту;

пісаць пад дыктоўку слоўнікавыя словы і кароткія сказы.

Вучні ведаюць і прымяняюць вучэбны матэрыял у розных відах дзейнасці:

разумеюць і ўзнаўляюць беларускую фанетыку, графіку і лексіку ў паўсядзённым жыцці і ў навучанні;

адшукваюць і выбіраюць патрэбны моўны матэрыял у тэксце;

разумеюць беларускамоўныя рукапісныя і друкаваныя тэксты.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

моўныя абазначэнні колеру, формы, велічыні, матэрыялу;

беларускія вершы, скорагаворкі, загадкі;

ілюстрацыі, апорныя словы, дэфармаваныя тэксты як матэрыял для складання апавядання.

Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:

разумець сюжэтныя і прадметныя малюнкі, серыі ілюстрацый;

чытаць невялікія тэксты з рознай інтанацыяй;

вылучаць назву тэксту, тэму тэксту;

прыдумваць загалоўкі да тэкстаў;

пісаць малыя і вялікія літары, іх злучэнні;

карыстацца тлумачальным і арфаграфічным слоўнікамі;

выкарыстоўваць формулы моўнага этыкету ў жыццёвых сітуацыях.

## IV клас (210/87 гадзін)

### Паўтарэнне вывучанага ў III класе (8/4 гадзіны)

Гукі і літары. Галосныя і зычныя гукі. Цвёрдыя і мяккія, звонкія і глухія зычныя гукі. Суаднясенне гукаў і літар. Склад. Націскны і ненаціскны склады. Перанос слоў.

Састаў слова. Разбор слова па саставе. Складанне слоў па схемах. Аднакаранёвыя словы. Правапіс звонкіх і глухіх зычных у корані. Правапіс прыставак аб-, ад-, над-, пад-. Правапіс апострафа і раздзяляльнага мяккага знака.

Сказ. Тыпы сказаў па мэце выказвання (апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя). Галоўныя і даданыя члены сказа. Сувязь слоў у сказе.

### Слова (12/6 гадзін)

Слова як адзінка мовы. Лексічнае значэнне слова. Адназначныя і мнагазначныя словы. Прамое і пераноснае значэнне слоў. Сінонімы і антонімы – блізкія і супрацьлеглыя па значэнні словы. Работа з тлумачальным слоўнікам.

## Састаў слова (82/30 гадзін)

Аднакаранёвыя словы. Правапіс звонкіх і глухіх зычных у корані, на стыку прыстаўкі і кораня, кораня і суфікса. Падваенне зычных на стыку прыстаўкі і кораня, кораня і суфікса. Разбор слоў па саставе. Утварэнне слоў пры дапамозе прыставак, суфіксаў.

## Часціны мовы (71/30 гадзін)

Назоўнік. Род назоўнікаў. Канчаткі назоўніка мужчынскага, жаночага, ніякага роду. Змяненне назоўнікаў па склонах. Склоны, склонавыя пытанні, дапаможныя словы да склонаў. Тры тыпы скланення назоўнікаў у адзіночным ліку.

Правапіс склонавых канчаткаў назоўнікаў 1-га скланення (табліца). Чаргаванні ў аснове на зычныя г, к, х у давальным і месным склонах.

Правапіс склонавых канчаткаў назоўнікаў 2-га скланення (табліца). Канчаткі -а (-я), -у (-ю) назоўнікаў у родным склоне. Чаргаванні зычных асноў назоўнікаў на г, к, х у месным склоне.

Правапіс склонавых канчаткаў назоўнікаў 3-га скланення (табліца). Выпадкі падаўжэння зычных гукаў паміж галоснымі назоўнікаў у месным склоне.

Адзіночны і множны лік назоўнікаў. Правапіс склонавых канчаткаў назоўнікаў у множным ліку (табліца).

Прыметнік. Змяненне прыметнікаў па ліках і родах. Канчаткі прыметнікаў мужчынскага, жаночага, ніякага роду адзіночнага ліку; множнага ліку.

Змяненне прыметнікаў па склонах. Скланенне прыметнікаў мужчынскага і ніякага роду (табліца). Скланенне прыметнікаў жаночага роду (табліца). Скланенне прыметнікаў у множным ліку (табліца).

Займеннік як часціна мовы. Роля займенніка ў сказе.

Дзеяслоў як часціна мовы. Правапіс часціцы не з дзеясловамі.

Адзіночны і множны лік дзеясловаў.

Змяненне дзеясловаў па часах. Змяненне дзеясловаў прошлага часу па ліках і родах.

## Сказ (15/7 гадзін)

Сказ. Сказы з аднароднымі членамі. Знакі прыпынку паміж аднароднымі членамі сказа. Злучнікі і, а, але.

Простыя і складаныя сказы. Складаны сказ. Знакі прыпынку ў складаным сказе.

Тэкст (12/5 гадзін)

Тэкст. Сэнсавыя часткі тэксту – абзацы. Структурныя часткі тэксту: пачатак, асноўная частка, заключная частка. Сувязь паміж часткамі тэксту. Загаловак як спосаб выражэння асноўнай думкі тэксту.

Тыпы тэксту: апавяданне, апісанне, разважанне, іх прыметы.

Вусны пераказ тэксту па плане. Работа з дэфармаваным тэкстам (узнаўленне лагічнай паслядоўнасці падзей у тэксце).

Паўтарэнне (10/5 гадзін)

Часціны мовы і іх асноўныя прыметы. Скланенне назоўнікаў і прыметнікаў. Тыпы сказаў. Знакі прыпынку.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ IV КЛАСА

Вучні маюць уяўленне:

аб залежнасці лексічнага значэння слова ад гукавога склада;

адназначнасці і мнагазначнасці слоў;

аднакаранёвых словах;

утварэнні слоў пры дапамозе прыставак, суфіксаў;

змяненні слоў розных часцін мовы;

склонавых канчатках назоўнікаў і прыметнікаў;

ролі займенніка ў сказе;

часе дзеяслова;

сказе як адзінцы маўлення;

сувязі сказаў у тэксце.

Вучні ўмеюць:

абазначаць на пісьме раздзяляльныя знакі, падоўжаныя і зацвярдзелыя гукі;

правільна пераносіць словы;

дапасоўваць словы – прыметы прадметаў да слоў – назваў прадметаў;

вызначаць склонавыя канчаткі назоўнікаў і прыметнікаў;

вызначаць час дзеясловаў;

адрозніваць тэкст ад сэнсава не звязанай групы сказаў;

пераказваць і складаць тэкст па пытаннях, малюнках і плане;

складаць план вуснага пераказу пры дапамозе пытанняў;

дакладна і графічна правільна пісаць малыя і вялікія літары;

пісаць дыктанты розных тыпаў.

Вучні ведаюць і прымяняюць вучэбны матэрыял у розных відах дзейнасці:

разумеюць і ўзнаўляюць беларускую фанетыку, графіку і лексіку ў паўсядзённым жыцці і ў навучанні;

падбіраюць словы, якія абазначаюць назвы, прыметы, дзеянні, на пэўную тэму;

разумеюць беларускамоўныя рукапісныя і друкаваныя тэксты.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

вершы, скорагаворкі, загадкі;

ілюстрацыі, апорныя словы, зададзены план як матэрыял для складання апавядання;

загалоўкі пры вызначэнні тэмы тэксту;

сюжэтныя малюнкі для калектыўнага складання тэкстаў.

Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:

разумець сэнс сюжэтных і прадметных малюнкаў, серыі ілюстрацый;

чытаць невялікія тэксты з рознай інтанацыяй;

вылучаць назву тэксту, тэму тэксту;

карыстацца тлумачальным і арфаграфічным слоўнікамі;

ужываць у маўленні формулы моўнага этыкету.

## V клас (210/87 гадзін)

### Паўтарэнне вывучанага ў IV класе (10/2 гадзіны)

Змяненне назоўнікаў па родах, ліках, склонах. Тыпы скланення назоўнікаў. Правапіс склонавых канчаткаў назоўнікаў 1, 2, 3-га скланення (табліцы). Чаргаванні зычных пры скланенні назоўнікаў. Правапіс склонавых канчаткаў назоўнікаў у множным ліку. Ужыванне прыназоўнікаў.

### Часціны мовы (160/69 гадзін)

#### Назоўнік (56/23 гадзіны)

Роля назоўнікаў у сказе. Нескланяльныя назоўнікі. Род, лік, склон нескланяльных назоўнікаў. Склонавыя канчаткі назоўнікаў множнага ліку. Ужыванне прыназоўнікаў з назоўнікамі.

#### Прыметнік (34/17 гадзін)

Прыметнік як часціна мовы. Змяненне прыметнікаў па родах, ліках, склонах. Скланенне прыметнікаў. Правапіс склонавых канчаткаў прыметнікаў мужчынскага, жаночага і ніякага роду (табліцы). Правапіс склонавых канчаткаў прыметнікаў множнага ліку.

#### Займеннік (15/5 гадзін)

Займеннік як часціна мовы. Асабовыя займеннікі 1, 2, 3-й асобы. Род і лік асабовых займеннікаў. Змяненне асабовых займеннікаў па склонах (табліца). Ужыванне прыназоўнікаў з займеннікамі.

#### Дзеяслоў (55/24 гадзіны)

Дзеяслоў як часціна мовы. Час дзеясловаў. Правапіс не з дзеясловамі. Неазначальная форма дзеяслова.

Змяненне дзеясловаў цяперашняга і будучага часу па асобах і ліках (табліцы).

Спражэнне дзеясловаў цяперашняга і будучага часу (табліцы).

Правапіс асабовых канчаткаў дзеясловаў 1-га, 2-га спражэнняў.

Змяненне дзеясловаў прошлага часу па ліках. Змяненне дзеясловаў прошлага часу адзіночнага ліку па родах. Суфіксы дзеясловаў прошлага часу.

### Сказ (15/8 гадзін)

Сказ. Галоўныя і даданыя члены сказа. Сувязь слоў у словазлучэнні.

Развітыя і неразвітыя сказы. Простыя і складаныя сказы. Злучнікі паміж часткамі складаных сказаў.

Аднародныя члены сказа. Інтанацыя пералічэння і злучнікі паміж аднароднымі членамі сказа. Сказы з аднароднымі дзейнікамі. Сказы з аднароднымі выказнікамі. Правапіс злучнікаў.

### Тэкст (10/5 гадзін)

Тэкст. Загаловак, тэма і асноўная думка тэксту. Лагічная паслядоўнасць сказаў у тэксце. Падзел тэксту на абзацы.

Тыпы тэкстаў: тэкст-апавяданне, тэкст-апісанне і тэкст-разважанне. Складанне тэкстаў па апорных словах, малюнках, сюжэце (з дапамогай настаўніка).

Тэкст-маналог, тэкст-дыялог.

Сувязь сказаў у тэксце.

### Паўтарэнне (15/3 гадзіны)

Часціны мовы і іх асноўныя прыметы.

Аднародныя члены сказа.

Тыпы сказаў. Практычнае выкарыстанне сказаў розных тыпаў.

Тыпы тэкстаў.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ V КЛАСА

Вучні маюць уяўленне:

аб алфавіце і яго выкарыстанні;

мнагазначных і роднасных словах, словах, супрацьлеглых па значэнні;

правілах пераносу слоў;

ужыванні вялікай літары ў напісанні назваў краін, рэк, азёр, мораў;

правапісе склонавых канчаткаў назоўнікаў і прыметнікаў у адзіночным і множным ліку;

неазначальнай форме дзеяслова;

галоўных і даданых членах сказа;

тыпах тэксту;

структурных частках тэксту, падзеле на абзацы.

Вучні ўмеюць:

вымаўляць і абазначаць на пісьме раздзяляльныя знакі, мяккі знак, падоўжаныя і зацвярдзелыя зычныя гукі;

правільна пераносіць словы;

суадносіць словы з прадметамі, распазнаваць словы паводле іх значэння, падбіраць аднакаранёвыя словы;

вызначаць род, лік, склон назоўнікаў і прыметнікаў;

вызначаць час, лік, спражэнне дзеясловаў;

вызначаць асобы займеннікаў;

вызначаць аднародныя члены сказа і правільна расстаўляць знакі прыпынку;

складаць спалучэнні слоў на зададзеную тэму;

правільна пісаць прыназоўнікі з іншымі словамі;

вызначаць галоўныя і даданыя члены сказа;

ставіць знакі прыпынку па зададзенай у сказе інтанацыі;

складаць тэкст са сказаў у правільнай паслядоўнасці, падзяляць яго на абзацы;

перакладаць словы і тэксты з рускай мовы на беларускую.

Вучні ведаюць і прымяняюць вучэбны матэрыял у розных відах дзейнасці:

разумеюць і ўзнаўляюць беларускую фанетыку, графіку і лексіку ў паўсядзённым жыцці і ў навучанні;

выкарыстоўваюць мнагазначныя і супрацьлеглыя па значэнні словы беларускай мовы;

разумеюць беларускамоўныя рукапісныя і друкаваныя тэксты розных тыпаў.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

вершы, скорагаворкі, загадкі, невялікія апавяданні;

ілюстрацыі, апорныя словы, план як матэрыял для складання апавядання;

мнагазначныя словы для складання паведамленняў.

Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:

разумець сюжэтныя і прадметныя малюнкі, серыі ілюстрацый;

чытаць тэксты з рознай інтанацыяй;

вылучаць назву і тэму тэксту, асноўную думку тэксту;

карыстацца тлумачальным і арфаграфічным слоўнікамі;

чытаць невялікія тэксты з рознай інтанацыяй;

ужываць у маўленні формулы моўнага этыкету.